УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ВІЦІНГ ЯЎГЕН ЭДУАРДАВІЧ

## ОПЕРНЫ СПЯВАК, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ БССР І ЛАТВ. ССР

## 21 ЛІПЕНЯ (2 ЖНІЎНЯ) 1884 Г. – 19 ЖНІЎНЯ 1959 Г.

# ЛУК’ЯНАВА ТАМАРА ІОСІФАЎНА, ЖОНКА Я.Э. ВІЦІНГА,

## ОПЕРНАЯ СПЯВАЧКА

## 8 САКАВІКА 1913 Г. – 23 САКАВІКА 2005 Г.

**ФОНД № 54**

**ВОПІС № 3**

**[1890-я гг.] – 1986 г.**

**МІНСК 2019**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 3 ф. 54**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Э. ВІЦІНГА | 1-15 | 1-2 |
| 1.1. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.Э. ВІЦІНГА | 4-6 | 1 |
| 1.2. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Э. ВІЦІНГА | 7-15 | 1-2 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ | 16-65 | 2-7 |
| 2.1. | ДАКУМЕНТЫ АРТЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ | 16-22 | 2-3 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ ДА Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ | 23-25 | 3 |
| 2.3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ | 26-55 | 3-6 |
| 2.3.1. | ПРАГРАМЫ І АФІШЫ КАНЦЭРТАЎ І ОПЕРНЫХ СПЕКТАКЛЯЎ | 33-55 | 4-6 |
| 2.4. | ДАКУМЕНТЫ ПРА Т.І. ЛУК'ЯНАВУ | 56-59 | 6-7 |
| 2.5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ | 60-65 | 7 |
| 3. | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Віцінг Яўген Эдуардавіч** нарадзіўся 21 ліпеня (2 жніўня) 1884 г. у г. Санкт-Пецярбурзе. Вучыўся: у Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі (1903-1904, клас С. Габеля), Міланскай кансерваторыі імя Дж. Вэрдзі (1904-1906, клас Дж. Дэльф'юмэ). Дэбют адбыўся ў 1906 г. у оперным тэатры г. П'ячэнцы, дзе ён выканаў партыю Эдгара ("Лючия ди Ламмермур" Г. Даніцэцці). Потым працаваў у трупе оперных тэатраў г. П'ячэнцы, г. Мілана. У 1906 г. вярнуўся ў Расію. У тым жа годзе пачаў спяваць у "Народным Доме" г. Санкт-Пецярбурга. Вядомыя ролі ў "Народным доме": Індыйскі госць ("Садко" М.А. Рымскага-Корсакава), Сінадал ("Демон" А.Г. Рубінштэйн), Фаўст ("Фауст" Ш. Гуно), Каніо ("Паяцы" Р. Леанкавала) і інш. З 1907 г. да 1918 г. працаваў тэнар-салістам Марыінскага тэатра. Вядомыя ролі ў Марыінскім тэатры: Самазванец ("Борис Годунов" М.П. Мусаргскага), Лыкаў ("Царская невеста" М.А. Рымскага-Корсакава), Хазэ ("Кармен" Ж. Бізэ), Руальд ("Рагнеда" А. Сярова), Герман ("Пиковая дама" П.І. Чайкоўскага), Садко ("Садко" М.А. Рымскага-Корсакава), Сотнік ("Пан Сотник" Г.А. Казачэнкі), Радамэс ( "Аида" Дж. Вэрдзі) і інш. У 1919 г. пераехаў жыць у Рыгу. Працаваў выкладчыкам у Латвійскай кансерваторыі ў г. Рыга (1920-1927), у трупе Латвійскага тэатра оперы і балета (1926-1944), выкладчыкам: у кансерваторыях Югаславіі (Белград, Заграб) (1930-1934), Каўнаскай кансерваторыі (1936-1940), Латвійскай кансерваторыі ў г. Рыга (1940-1950). Паралельна з працай у тэатрах і кансерваторыях у перыяд з 1920 г. да 1940 г. гастраліраваў у складзе трупы Латвійскай нацыянальнай оперы і балета г. Рыга. Выступаў з гастролямі ў Англіі, Іспаніі (1924-1926, 1932, 1934, Мадрыд, Барселона), Італіі (1924-1926, 1932, Мілан), Кітаі (1929, Шанхай), Латвіі (1935), Літве, Румыніі (1932, Бухарэст), Францыі (1924-1926, 1934), Чэхаславакіі, Эстоніі (1930), Югаславіі (1931, Белград, Заграб). З 1950 г. да 1959 г. па запрашэнню рэктара Белдзяржкансерваторыі А.В. Багатырова працаваў выкладчыкам у Белдзяржкансерваторыі.

Узнагароджаны медалём "За доблестный и самоотверженный труд в период Великой Отчественной войны" (1946). Заслужаны дзеяч мастацтваў Латв.ССР (1946) і БССР (1955).

Памёр Я.Э. Віцінг 19 жніўня 1959 г. Пахаваны ў Мінску на Усходніх могілках.

**Лук'янава Тамара Іосіфаўна (народжаная Шых)** нарадзілася 8 сакавіка 1913 г. у г. Рызе. У 1916 г. з бацькамі пераехала жыць на станцыю Іланскую ў Краснаярскі край. З 1921 г. да 1932 г. вучылася ў школе на станцыі Імяньпо Кітайска-Усходняй чыгункі. Пасля заканчэння школы працавала статысткай Новасібірскага швейнага камбіната. З верасня 1933 г. да кастрычніка 1934 г. вучылася на курсах Дзяржплана СССР. Працавала эканамістам-статыстам абласнога Упраўлення народна-гаспадарчага ўліку (УНГУ) у г. Уладзівастоку (1934-1935), сакратаром завода на чыгуначнай станцыі Вугальная Далёкаўсходняй чыгункі (1935-1936), статыстам планавага аддзела Дальстрою г. Уладзівастока (1936-1938). У 1938 г. была рэпрэсавана, а ў 1939 г. – рэабілітавана.[1] Пасля працавала загадчыкам статыстычнай групы трэста "Галоўхлеб" г. Уладзівастока (1939-1941), бухгалтарам "Энэргазбыту" г. Новасібірска (сакавік 1942-студзень 1944), артысткай Новасібірскай філармоніі (студзень 1944-жнівень 1945), салісткай Дзяржфілармоніі Латв.ССР (верасень 1945-верасень 1947). З 1945 г. да 1949 г. вучылася ў Дзяржкансерваторыі Латв.ССР. Потым працавала салісткай Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР (1947-1950), Белдзяржфілармоніі (сакавік 1951-1965). Вядомыя ролі ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета Латв.ССР: Царэўна Лебедзь ("Сказка о царе Солтане" М.А. Рымскага-Корсакава) (1947), Мікаэла ("Кармен" Ж. Бізэ) [1947-1950], Мімі ("Богема" Дж. Пучыні) (1948), Маргарыта ("Фауст" Ш. Гуно) (1948), Царэўна ("Кащей Бессмертный" М.А. Рымскага-Корсакава) (1950) і інш. З 1965 г. да 1969 г. працавала выкладчыкам у Маладзечанскім музычным вучылішчы імя М.-К. Агінскага.

Узнагароджана: ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1955); медалём "За трудовое отличие" (за ўдзел у Дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Масква) (1955); ганаровымі граматамі – Прэзідыума Вярхоўнага Савета Латв.ССР (за паспяховую і шматгадовую творчую працу ў мастацтве) (1949), ЦК УЛКСМ (за ўдзел у заключным канцэрце Усесаюзнага агляду студэнтаў-вакалістаў кансерваторый, прысвечаным XI з'езду УЛКСМ) (1949).

Памерла Т.І. Лук'янава 23 сакавіка 2005 г. Пахавана ў Мінску на Усходніх могілках.[2]

Дакументы, якія склалі вопіс № 3 сямейнага фонда Я.Э. Віцінга і Т.І. Лук'янавай, паступілі ў БДАМЛМ ад Т.І. Лук'янавай у 1976, 1986 гг. У выніку навуковага-тэхнічнай апрацоўкі ў вопісе сфарміравана 65 спраў (228 дак.) за [1890-я гг.]–1968 г.

---

[1] https://ru.openlist.wiki/Лукьянова_Тамара_Иосифовна_(1913)
[2] https://pomnim.online

Вопіс складаецца з 2 раздзелаў:

Першы раздзел “Дакументы Я.Э. Віцінга” складаецца з двух падраздзелаў. Справы ў ім сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе за [1890-я гг.]–1956 г.

Другі раздзел “Дакументы Т.І. Лук’янавай” складаецца з пяці падраздзелаў. Справы ў ім сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе. У гэтым раздзеле змешчаны: фатаграфіі ў ролях і сцэнах з оперных спектакляў, афішы оперных спектакляў і канцэртаў з удзелам Т.І. Лук’янавай, пісьмы да Т.І. Лук’янавай і інш. за 1944–1968 гг.

Прадмову склала
Вяд. архівіст Н.П. Прынько
2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Э. ВІЦІНГА** | | | | |
| 1 | Арыя Элезара з оперы Ф. Галеві "Жидовка". Для голасу з фартэпіяна. На нямецкай мове. Друкаванае выданне | 1922 | 8 | 1 | |
| 2 | Арыя Каніо з оперы Р. Леанкавала "Паяцы". Клавір. Урывак. Рукапіс перапісчыка | [1926-1929 гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 3 | Фатаграфіі Я.Э. Віцінга ў ролях Радамеса ("Аида" Дж. Вэрдзі) і інш. і сцэны з неўстаноўленага опернага спектакля, пастаўленага ў Марыінскім тэатры | [1907-1918] | 3 | 3 | |
| | **1.1. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.Э. ВІЦІНГА** | | | | |
| 4 | Працоўная кніжка на імя Я.Э. Віцінга за 1944-1950 гг. На рускай і латышскай мовах | 1944 | 9 | 1 | |
| 5 | Афіша канцэрта Дзяржфілармоніі Латв.ССР з удзелам Я.Э. Віцінга. На латышскай і рускай мовах | 1945 | 1 | 1 | |
| 6 | Афіша канцэрта студэнтаў Белдзяржкансерваторыі з удзелам студэнтаў класа Я.Э. Віцінга | 1952 | 1 | 1 | |
| | **1.2. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Я.Э. ВІЦІНГА** | | | | |
| 7 | Фатаграфіі Я.Э. Віцінга, індывідуальныя | [1930-я гг.] | 2 | 2 | |
| 8 | Фатаграфія Я.Э. Віцінга з Звайгзнэ, Т.І. Лук'янавай (жонкай), С.І. Мігаем, К. Пятраўскасам | 1949, 1956 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 9 | Фотапартрэт М.Г. Васільевай (1-ай жонкі Я.Э. Віцінга) | [пач. 1900-х гг.] | 1 | 1 | |
| 10 | Фотапартрэт М.І. Ганцкевіч (сястры Я.Э. Віцінга) | [пач. 1900-х гг.] | 1 | 1 | |
| 11 | Фатаграфія [дома ў Мінску, у якім жыў Я.Э. Віцінг] | [1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 12 | Фатаграфія І.В. Міцкевіча, індывідуальная. Бабруйск.<br>Фота В.Л. Кацэнбогіна | [1890-я - пач.1900-х гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | Групавая фатаграфія неўстаноўленых асоб | [1940-я - 1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| 14 | Дзіцячы фотапартрэт (асоба неўстаноўлена) | [пач. 1900-х гг.] | 1 | 1 | |
| 15 | Неўстаноўлены аўтар. Сельскі пейзаж. [Латвія]. Папера, аловак, вугаль, мел | [1920-я гг. - 1940] | 1 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ** | | | | |
| | **2.1. ДАКУМЕНТЫ АРТЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ** | | | | |
| 16 | Фатаграфія сцэны з опернага спектакля Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР "Великая дружба" В. Мурадэлі, пастаўленага рэж. М. Васільевым з удзелам Т.І. Лук'янавай (у ролі Мейраны) і інш. | 1947 | 1 | 1 | |
| 17 | Фатаграфія сцэны з опернага спектакля Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР "Сказка о царе Салтане", пастаўленага рэж. М. Васільевым з удзелам Т.І. Лук'янавай (у ролі Царэўны Лебедзі), Э. Плуксна (у ролі Царэвіча Гвідона) | 1947 | 1 | 1 | |
| 18 | Фатаграфіі Т.І. Лук'янавай у ролі Маргарыты ("Фауст" Ш. Гуно, рэж. К. Ліепа), сыгранай у Дзяржаўным тэатры оперы і балета Латв.ССР | 1948 | 2 | 2 | |
| 19 | Фатаграфія сцэны з опернага спектакля Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР "Богема" Дж. Пучыні, пастаўленага рэж. К. Ліепа з удзелам Т.І. Лук'янавай (у ролі Мімі), І. Пятроўскага (у ролі Рудольфа) | 1948 | 1 | 1 | |
| 20 | Фатаграфія сцэны з опернага спектакля Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР "Кармен" Ж. Бізэ, пастаўленага рэж. К. Ліепа з удзелам Т.І. Лук'янавай (у ролі Мікаэлы), А. Скары (у ролі Дона Хазэ) | 1950 | 1 | 1 | |
| 21 | Фатаграфіі Т.І. Лук'янавай у ролі Царэўны ("Кащей Бессмертный" М.А. Рымскага-Корсакава, рэж. В. Волкава), сыгранай у Дзяржаўным тэатры оперы і балета Латв.ССР і сцэн з гэтага опернага спектакля з удзелам Т.І. Лук'янавай, А. Фрынберга (у ролі | 1950 | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Кашчэя Бессмяротнага) і інш. | | | | |
| | * * * | | | | |
| 22 | Т.І. Лук'янава. Нататка пра Дзяржкансерваторыю Латв.ССР. На латышскай мове.<br>Выразка з газеты | 1949 | 1 | 1 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ ДА Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ** | | | | |
| 23 | Пісьмо супрацоўнікаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР Т.І. Лук'янавай у сувязі з яе канцэртам у г. Рыга | 1955 | 2 | 1 | |
| 24 | Пісьмы прыхільнікаў да спявачкі Т.І. Лук'янавай | 1956-1957 | 5 | 3 | |
| 25 | Пісьмы і паштоўкі кампазітара В.А. Белага | 1960-1967 | 24 | 10 | |
| | **2.3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ** | | | | |
| 26 | "Репертуарный список певицы Т.И. Лукьяновой с 15/I-44 г."<br>Блакнот, аўтограф | 1944-1947 | 46 | 1 | |
| 27 | "Дневник артистки Лукьяновой Т.И. с 15.01.1944 г. о пропетых операх и концертах".<br>Блакнот, аўтограф | 1944-1968 | 58 | 1 | |
| 28 | Запрашальныя білеты Дома работнікаў мастацтваў, Палаца піянераў Латв.ССР, Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі на творчыя вечары і інш. на імя Т.І. Лук'янавай | 1947-1958 | 13 | 6 | |
| 29 | Дакументы педагагічнай і творчай дзейнасці Т.І. Лук'янавай (характарыстыка, загад, пасведчанне і інш.).<br>Арыгінал і копіі | 1955-1964 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 30 | Дакументы канцэрта Усесаюзнага агляду вакалістаў-студэнтаў кансерваторый, прысвечаны XI з'езду ВЛКСМ (Масква) з удзелам Т.І. Лук'янавай (каляндар агляду, праграма, запрашэнне, пасведчанне) | 1949 | 23 | 4 | |
| 31 | Дакументы Дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Масква з удзелам Т.І. Лук'янавай (памятка удзельніка, запрашэнне, пасведчанне, праграма) | 1955 | 15 | 5 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 32 | Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні Т.І. Лук'янавай медалём "За працоўную адзнаку".<br>Выразка з газеты | 1955 | 1 | 1 | |
| | **2.3.1. ПРАГРАМЫ І АФІШЫ КАНЦЭРТАЎ І ОПЕРНЫХ СПЕКТАКЛЯЎ** | | | | |
| 33 | Праграмы Дзяржкансерваторыі Латв.ССР, прысвечаныя пачатку і заканчэнню навучальнага года, заключнага Акт-канцэрта, адкрытага вучнёўскага вечара класа канцэртмайстараў-акампаніятараў з удзелам Т.І. Лук'янавай у залах кансерваторыі і ўніверсітэта. На латышскай і рускай мовах | 1946-1949 | 6 | 4 | |
| 34 | Праграма VII канцэрта гістарычнага цыкла камернай музыкі Дзяржфілармоніі Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай | [1946-1947] | 1 | 1 | |
| 35 | Праграмы оперных спектакляў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР: "Борис Годунов" М.П. Мусаргскага, "Богема" Дж. Пучыні, "Кармен" Ж. Бізэ, "Кащей Бессмертный" М.А. Рымскага-Корсакава і інш. з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай мовах.<br>У праграме опернага спектакля "Фауст" Ш. Гуно змешчаны фатаграфіі сцэн з гэтага опернага спектакля. Лл. 20-28 | [1947-1950] | 35 | 8 | |
| 36 | Праграмы творчых вечароў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай мовах | [1947-1950] | 4 | 2 | |
| 37 | Праграмы канцэртаў, вечароў Белдзяржфілармоніі, прысвечаных 125-годдзю з дня смерці Ф. Шуберта, 10-годдзю з дня вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў, 5-й гадавіне з дня абвяшчэння КНР і інш. з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1953-1962 | 21 | 9 | |
| | * * * | | | | |
| 38 | Афішы вечароў эстрады і гумару Новасібірскай дзяржфілармоніі з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1943, 1944 | 2 | 2 | |
| 39 | Гастрольная афіша Новасібірскай дзяржфілармоніі з удзелам Т.І. Лук'янавай ва Узбекістане | 1944 | 1 | 1 | |
| 40 | Афішы канцэртаў салісткі Дзяржфілармоніі Латв.ССР Т.І. Лук'янавай у канцэртных залах Латв.ССР. На латышскай і рускай мовах | [1945-1947] | 3 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 41 | Афішы канцэрта, канцэртаў-лекцый салістаў Дзяржфілармоніі Латв.ССР у канцэртных залах Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай мовах | [1945-1947] | 3 | 3 | |
| 42 | Афішы канцэртаў, канцэрта-лекцыі маладых выканаўцаў, салістаў Дзяржфілармоніі Латв.ССР у канцэртных залах Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1946-1950 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 43 | Афішы справаздачнага канцэрта, канцэрта Усесаюзнага агляду студэнтаў Азербайджанскай, Беларускай, Латвійскай і інш. кансерваторый з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1947, 1949 | 2 | 2 | |
| 44 | Афішы VII канцэрта гістарычнага цыкла камернай музыкі "Трио радиокомитета", лекцый-канцэртаў салістаў Дзяржкансерваторыі Латв.ССР у канцэртных залах Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1947 | 6 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 45 | Афішы канцэртаў маладых артыстаў, салістаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР у канцэртных залах Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай мовах | [1947-1950] | 4 | 4 | |
| 46 | Афішы оперных спектакляў "Борис Годунов" М.П. Мусаргскага, "Великая дружба" В. Мурадэлі, "Кармен" Ж. Бізэ, "Сказка о царе Салтане" М.А. Рымскага-Корсакава, пастаўленых Дзяржаўным тэатрам оперы і балета Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай мовах | 1947-1950 | 6 | 6 | |
| 47 | Афішы опернага спектакля "Фауст" Ш. Гуно, пастаўленага Дзяржаўным тэатрам оперы і балета Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай мовах | 1948-1951 | 4 | 4 | |
| 48 | Афішы канцэртаў маладых артыстаў, салістаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай мовах | 1949-1950 | 5 | 5 | |
| 49 | Афішы опернага спектакля "Кащей Бессмертный" М.А. Рымскага-Корсакава, пастаўленага Дзяржаўным тэатрам оперы і балета Латв.ССР з удзелам Т.І. Лук'янавай. На латышскай і рускай | 1949, 1950 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | мовах.<br>На адной з афіш змешчаны фатаграфіі сцэн з гэтага опернага спектакля | | | | |
| | * * * | | | | |
| 50 | Афішы канцэртаў артыстаў і салістаў Белдзяржфілармоніі з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1952, 1963 | 5 | 5 | |
| 51 | Афішы тэатральнага сезона 1953-1954 гг. Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета з удзелам Т.І. Лук'янавай. На грузінскай і рускай мовах.<br>Прыкладзена тэлеграма дырэктара Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета Дз.С. Мчадлідзэ Т.І. Лук'янавай пра яе ўдзел у оперным спектаклі | 1953 | 3 | 2 | |
| 52 | Афішы канцэртаў Белдзяржфілармоніі з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1955 | 2 | 2 | |
| 53 | Гастрольныя афішы канцэртаў салістаў Белдзяржфілармоніі з удзелам Т.І. Лук'янавай у г.г. Масква і Рыга. На рускай і латышскай мовах | 1955 | 4 | 4 | |
| 54 | Афішы канцэртаў салістаў Белдзяржфілармоніі з удзелам Т.І. Лук'янавай | 1957-1962 | 4 | 4 | |
| 55 | Афішы эстрадных канцэртаў з удзелам салісткі Белдзяржфілармоніі Т.І. Лук'янавай | 1962-[1965] | 3 | 3 | |
| | **2.4. ДАКУМЕНТЫ ПРА Т.І. ЛУК'ЯНАВУ** | | | | |
| 56 | Рэцэнзіі і водгукі на канцэрты і гастрольныя канцэрты салістаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР, Белдзяржфілармоніі з упамінаннем Т.І. Лук'янавай.<br>Выразкі з газет | 1946-1967 | 12 | 12 | |
| 57 | Рэцэнзія на оперныя спектаклі "Сказка о царе Салтане", "Фауст".<br>Артыкулы пра Рыжскую дзяржкансерваторыю, Рэспубліканскі конкурс вакалістаў, творчыя сустрэчы з упамінаннем Т.І. Лук'янавай. На беларускай, латышскай і рускай мовах.<br>Выразкі з газет | 1947-1958 | 7 | 7 | |
| | * * * | | | | |
| 58 | "30 лет Государственного театра оперы и балета Латвийской ССР". На латышскай і рускай мовах. Рыга. | 1949 | 29 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Друкаванае выданне з фатаграфіямі сцэн з оперных спектакляў, з упамінаннем Т.І. Лук'янавай | | | | |
| 59 | Праграмы радыёперадач з удзелам Т.І. Лук'янавай. Выразкі з газет. На адв. л.22 змешчана нататка пра Т.І. Лук'янаву | 1955-1964 | 35 | 34 | |
| | **2.5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Т.І. ЛУК'ЯНАВАЙ** | | | | |
| 60 | Фатаграфіі Т.І. Лук'янавай, індывідуальныя | 1951-1962 | 6 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 61 | Фатаграфія Т.І. Лук'янавай з Б.М. Палявым, яго жонкай і інш. знаёмымі ў час адпачынку ў Юрмале | 1946 | 1 | 1 | |
| 62 | Фатаграфіі Т.І. Лук'янавай, індывідуальныя і ў групах з Я.Э. Віцінгам, М.І. Дзянісавым, В.П. Дуброўскім і інш. у час рэпетыцый і канцэртаў | 1947-1961 | 12 | 12 | |
| 63 | Фатаграфія Т.І. Лук'янавай з салістамі Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латв.ССР | 1949 | 1 | 1 | |
| 64 | Фатаграфія Т.І. Лук'янавай з прадстаўнікамі індыйскай дэлегацыі ў час сустрэчы | 10 мая 1956 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 65 | Фатаграфія кадра з мастацкага фільма рэж. Я. Фрыда "Возвращение" з удзелам М.К. Сіманава (у ролі Сяргея Пятровіча Іванова), Ул.М. Тумалар'янца (у ролі Мікіты), К.М. Злобіна (у ролі Міліцыянера). ("Ленфильм"). З аўтографам М.К. Сіманава | 1940 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 65 (шэсцьдзесят пяць)

спраў з № 1 па № 65 , 228 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.